| Заданне.<br>Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| **А13.** Адзначце прыклады, у якіх выдзеленыя словы трэба пісаць разам:<br>1) (***раз***) ***пораз*** азірацца;<br>2) (***у***) ***абмен*** на маркі;<br>3) падзяліць (***па***) ***роўну***;<br>4) быць (***на***) ***пагатове***;<br>5) (***усё***) ***роўна*** прыгожа.<br><br>**Адказ:** 3,4 | 1) ***раз-пораз*** *азірацца* → складанае прыслоўе, утворанае паўтарэннем таго самага слова (з далучэннем прыстаўкі), пішацца праз злучок;<br>2) ***у абмен*** *на маркі* → блізкае да прыслоўя па значэнні і функцыі спалучэнне назоўніка, які пачынаецца з галоснага, з прыназоўнікам ***у*** пішацца асобна;<br>3) *падзяліць* ***пароўну*** → прыслоўе, утворанае ад прыметніка ***роўны*** пры дапамозе прыстаўкі ***па-*** і суфікса ***-у***, пішацца разам;<br>4) *быць* ***напагатове*** → прыслоўе, утворанае ад назоўніка, які ў сучаснай беларускай мове самастойна не ўжываецца, пішацца разам;<br>5) ***усё роўна*** *прыгожа* → блізкае да прыслоўя па значэнні і функцыі спалучэнне слоў ***усё роўна*** пішацца асобна | Марфалогія і арфаграфія.<br>Культура маўлення.<br>Правапіс прыслоўяў і спалучэнняў слоў, блізкіх да прыслоўяў | **Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 7 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 27–30.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; §§ 19, 43; практ. 344 |
| **А14.** Адзначце прыклады, у якіх часціцу ***не*** з выдзеленымі словамі трэба пісаць асобна:<br>1) (***не***) ***як*** наведаць;<br>2) (***не***) ***дачакаўшыся*** адказу;<br>3) (***не***) ***шкада*** часу;<br>4) (***не***) ***пасоленая*** мною ка́ша;<br>5) (***не***) ***адхільны*** клопат.<br><br>**Адказ:** 2,3,4 | 1) ***неяк*** *наведаць* → ***не*** ў неазначальным прыслоўі – прыстаўка (пішацца разам);<br>2) ***не дачакаўшыся*** *адказу* → ***не*** з дзеепрыслоўем пішацца асобна;<br>3) ***не шкада*** *часу* → ***не*** са словам ***шкада*** пішацца асобна;<br>4) ***не пасоленая*** *мною ка́ша* → ***не*** з поўным дзеепрыметнікам, пры якім ёсць залежнае слова ***мною***, пішацца асобна;<br>5) ***неадхільны*** *клопат* → ***не-*** – прыстаўка, без якой прыметнік ***неадхільны*** не ўжываецца | Марфалогія і арфаграфія.<br>Культура маўлення.<br>Правапіс часціцы ***не*** з рознымі часцінамі мовы | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 6 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; § 42.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 7 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 12, 15, 26, 47.<br>**З.І. Бадзевіч** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 8 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; § 5.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 48 |
| **А15.** Адзначце сказы, у якіх на месцы пропуску ўжываецца часціца ***ні***: | 1) ***Не*** *раз я дапамагаў дзядулю плесці лазовыя кошыкі, у адзін з якіх і сёння збіраю* | Марфалогія і арфаграфія. | **Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 7 класа |

| Заданне.<br>Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў.<br>Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| 1) __ раз я дапамагаў дзядулю плесці лазовыя кошыкі, у адзін з якіх і сёння збіраю грыбы.<br>2) Добрае слова __ забываецца.<br>3) Хіба ж можна __ любіць магутнага Дняпра і празрыстай Прыпяці, паўнаводнай Дзвіны і ласкавага Нёмана!<br>4) Колькі б __ раілі правяраць, а сябрам сваім я заўжды проста давяраю.<br>5) Як толькі пачынае цвісці ліпа, __ хвілінкі вольнай няма ў чмялёў і пчолак.<br><br>**Адказ:** 4,5 | *грыбы.* → у спалучэнні ***не раз*** са значэннем *'часта'* ўжываецца часціца ***не***;<br>2) *Добрае слова **не** забываецца.* → для надання адмоўнага значэння сказу пры дзеяслове-выказніку ўжываецца часціца ***не***;<br>3) *Хіба ж можна **не** любіць магутнага Дняпра і празрыстай Прыпяці, паўнаводнай Дзвіны і ласкавага Нёмана!* → для надання сцвярджэння сказу пытальна-клічнага тыпу ўжываецца часціца ***не***;<br>4) *Колькі б **ні** раілі правяраць, а сябрам сваім я заўжды проста давяраю.* → у даданай частцы складаназалежнага сказа *Колькі б **ні** раілі правяраць* для ўзмацнення сцвярджэння ўжываецца часціца ***ні***;<br>5) *Як толькі пачынае цвісці ліпа, **ні** хвілінкі вольнай няма ў чмялёў і пчолак.* → для ўзмацнення адмаўлення, якое выражана словам ***няма***, ужываецца часціца ***ні***; часціца стаіць пры назоўніку ***хвілінкі*** ў форме роднага склону | Культура маўлення. Часціцы ***не*** і ***ні***, іх ужыванне і правапіс | установаў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; § 46.<br>**З.І. Бадзевіч** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 8 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; практ. 23.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 47 |
| **А16.** Адзначце словазлучэнні, якія адпавядаюць нормам беларускай літаратурнай мовы:<br>1) два доўгіх тыдні;<br>2) багаты на традыцыі;<br>3) падобны да маці;<br>4) дзякаваць брата;<br>5) за сто метраў ад школы.<br><br>**Адказ:** 2,3,5 | 1) *два доўгія тыдні* → пры лічэбніку ***два*** назоўнік і залежны ад яго прыметнік ужываюцца ў форме множнага ліку назоўнага склону;<br>2) *багаты на традыцыі* → характэрная для беларускай мовы сінтаксічная канструкцыя;<br>3) *падобны да маці* → у словазлучэнні з прыметнікам ***падобны*** ўжываецца назоўнік у форме роднага склону з прыназоўнікам ***да***;<br>4) *дзякаваць брату* → пры дзеяслове са значэннем ветлівасці ***дзякаваць*** назоўнік ужываецца ў форме давальнага склону;<br>5) *за сто метраў ад школы* → характэрная для беларускай мовы сінтаксічная канструкцыя | Сінтаксіс і пунктуацыя. Культура маўлення. Словазлучэнне як сінтаксічная адзінка. Асаблівасці дапасавання і кіравання ў беларускай мове | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 6 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; практ. 290.<br>**З.І. Бадзевіч** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 8 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; § 8; практ. 55.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 11 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 9; С. 242–244 |
| **А17.** Адзначце сказы, у якіх выдзеленае (выдзеленыя) слова (словы) – ***азначэнне***: | 1) *Некалі жытнія бліны гатавалі для гасцей-сваякоў, грачанікі – на Масленіцу, аўсяныя* | Сінтаксіс і пунктуацыя. | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа |

| Заданне.<br>Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| 1) Некалі жытнія бліны гатавалі для гасцей-сваякоў, грачанікі – на Масленіцу, аўсяныя бліны, ***рашчыненыя звечара***, пяклі ў будні.<br>2) Пасля прачытання цікавай кнігі ў мяне заўжды ўзнікае жаданне ***падзяліцца*** з кім-небудзь прачытаным.<br>3) Зіма, на ***маю*** думку, самая загадкавая пара́ года.<br>4) ***Малыя*** любяць сябраваць з дарослымі.<br>5) Радзіма наша ***цудоўная***, багаццяў розных поўная.<br><br>**Адказ:** 1,2 | *бліны, рашчыненыя звечара, пяклі ў будні.* → дзеепрыметнікавы зварот ***рашчыненыя звечара*** абазначае прымету прадмета (***бліны***), адказвае на пытанне *якія?* і з’яўляецца дапасаваным азначэннем;<br>2) *Пасля прачытання цікавай кнігі ў мяне заўжды ўзнікае жаданне падзяліцца з кім-небудзь прачытаным.* → інфінітыў ***падзяліцца*** адносіцца да дзейніка-назоўніка ***жаданне***, адказвае на пытанне *якое?* і з’яўляецца недапасаваным азначэннем;<br>3) *Зіма, на маю думку, самая загадкавая пара́ года.* → словазлучэнне ***на маю думку*** граматычна не звязана з іншымі словамі ў сказе, указвае на крыніцу паведамлення і з’яўляецца пабочным; пабочнае словазлучэнне не з’яўляецца членам сказа;<br>4) *Малыя любяць сябраваць з дарослымі.* → ужыты ў значэнні назоўніка прыметнік ***малыя*** адказвае на пытанне *хто?* і з’яўляецца дзейнікам;<br>5) *Радзіма наша цудоўная, багаццяў розных поўная.* → прыметнік ***цудоўная*** з’яўляецца іменнай часткай аднаго з аднародных састаўных іменных выказнікаў (дзеяслоў-звязка адсутнічае) | Культура маўлення. Дзейнік і выказнік, спосабы іх выражэння. Дадаsuccessfulы члены сказа. Спосабы выражэння даданых членаў сказа | ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 1. Мінск: НІА, 2014; §§ 13, 14, 16.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 1. Мінск: НІА, 2019; §§ 19, 21, 22.<br>**В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 6 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; § 56.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 7 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 7, 51.<br>**З.І. Бадзевіч** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 8 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 19, 22, 44.<br>**Н.М. Гардзей** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 9 класа агульнаадукацыйных устаноў з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2011; § 15.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 11 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 14 |
| **А18.** Адзначце аднасастаўныя сказы:<br>1) Павуцінка бабінага лета, не спяшайся ўдалеч адлятаць. | 1) *Павуцінка бабінага лета, не спяшайся ўдалеч адлятаць.* → аднасастаўны сказ: дзейніка няма (развіты зваротак ***Павуцінка*** | Сінтаксіс і пунктуацыя. Культура маўлення. | **Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з |

| Заданне.<br>Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| 2) Абеліск «Мінск – горад-герой» адкрылі ў 1985 годзе.<br>3) З бору павеяла сасновым водарам.<br>4) Аржаная каша сама сябе хваліць.<br>5) Паветра ў маі духмянае, жыватворнае.<br><br>**Адказ:** 1,2,3 | ***бабінага лета*** членам сказа не з'яўляецца); выказнік выражаны дзеясловам у форме загаднага ладу 2-й асобы адзіночнага ліку;<br>2) *Абеліск «Мінск – горад-герой» адкрылі ў 1985 годзе.* → аднасастаўны сказ: дзейніка няма; выказнік выражаны дзеясловам у форме абвеснага ладу прошлага часу множнага ліку;<br>3) *З бору павеяла сасновым водарам.* → аднасастаўны сказ: дзейніка няма; выказнік выражаны асабовым дзеясловам у безасабовым значэнні;<br>4) *Аржаная каша сама сябе хваліць.* → двухсастаўны сказ: дзейнік выражаны назоўнікам у форме назоўнага склону; выказнік выражаны дзеясловам у форме абвеснага ладу цяперашняга часу 3-й асобы адзіночнага ліку;<br>5) *Паветра ў маі духмянае, жыватворнае.* → двухсастаўны сказ: дзейнік выражаны назоўнікам у форме назоўнага склону; аднародныя састаўныя іменныя выказнікі выражаны прыметнікамі (дзеяслоў-звязка адсутнічае) | Двухсастаўныя сказы.<br>Аднасастаўныя сказы, іх будова | беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 1. Мінск: НІА, 2019; § 28.<br>**З.І. Бадзевіч** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 8 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 15–19, 27–31.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 11 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 11 |
| **А19.** Адзначце сказы, у якіх на месцы пропуску ***абавязкова*** ставіцца працяжнік:<br>1) Роднае слова, безумоўна, __ першая крыніца, праз якую чалавек пазнае жыццё і навакольны свет.<br>2) Вясёлка __ нібы каляровы каромысел, які нехта ўзяў і праз рэчку перакінуў.<br>3) Спецыялісты ў нашай лячэбніцы __ што трэба!<br>4) Жыта __ не жыта, калі ў ім няма васількоў.<br>5) Куцця __ абрадавая каша, якая часцей за ўсё гатуецца з ячных круп.<br><br>**Адказ:** 3,5 | 1) *Роднае слова, безумоўна, першая крыніца, праз якую чалавек пазнае жыццё і навакольны свет.* → паміж дзейнікам і выказнікам, выражанымі назоўнікамі ў форме назоўнага склону, стаіць пабочнае слова ***безумоўна***, таму працяжнік ***не ставіцца***;<br>2) *Вясёлка нібы каляровы каромысел, які нехта ўзяў і праз рэчку перакінуў.* → паміж дзейнікам і выказнікам, выражанымі назоўнікамі ў форме назоўнага склону, працяжнік ***не ставіцца***, бо пры выказніку ёсць параўнальны злучнік ***нібы***;<br>3) *Спецыялісты ў нашай лячэбніцы* **–** *што* | Сінтаксіс і пунктуацыя.<br>Культура маўлення.<br>Працяжнік паміж дзейнікам і выказнікам | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 1. Мінск: НІА, 2014; § 13.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 1. Мінск: НІА, 2019; § 20.<br>**В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 6 класа |

| Заданне.<br>Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| | *трэба!* → паміж дзейнікам, выражаным назоўнікам у форме назоўнага склону, і выказнікам, выражаным фразеалагізмам, ***абавязкова*** ставіцца працяжнік;<br>4) *Жыта не жыта, калі ў ім няма васількоў.* → паміж дзейнікам і выказнікам, выражанымі назоўнікамі ў форме назоўнага склону, працяжнік ***не ставіцца***, бо пры выказніку ёсць адмоўная часціца ***не***;<br>5) *Куцця* **–** *абрадавая каша, якая часцей за ўсё гатуецца з ячных круп.* → паміж дзейнікам і выказнікам, выражанымі назоўнікамі ў форме назоўнага склону, ***абавязкова*** ставіцца працяжнік | | установаў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; § 12.<br>**З.І. Бадзевіч** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 8 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; § 21 |
| **А20.** Адзначце сказы, у якіх на месцы пропуску трэба паставіць коску:<br>1) Шпакі ўмеюць пераймаць салаўіныя спевы__ і посвіст івалгаў, і мяўканне катоў.<br>2) Гайдаюцца на хвалях нарачанскіх лёгкія__ рыбацкія чаўны.<br>3) Каваль, інжынер, матэматык, гісторык__ усе яны могуць быць паэтамі сваёй справы.<br>4) Белай посцілкаю ахутваў вячэрні туман палі, лугі__ ды рэчку.<br>5) Восеньскі дождж не звініць__ а шапоча.<br><br>**Адказ:** 1,5 | 1) *Шпакі ўмеюць пераймаць салаўіныя спевы****,*** *і посвіст івалгаў, і мяўканне катоў.* → коскамі раздзяляюцца аднародныя дапаўненні, звязаныя паўторным спалучальным злучнікам ***і***;<br>2) *Гайдаюцца на хвалях нарачанскіх лёгкія рыбацкія чаўны.* → паміж неаднароднымі азначэннямі, выражанымі якасным прыметнікам ***лёгкія*** і адносным прыметнікам ***рыбацкія***, коска не ставіцца;<br>3) *Каваль, інжынер, матэматык, гісторык* **–** *усе яны могуць быць паэтамі сваёй справы.* → ***усе яны*** – словазлучэнне, якое выконвае функцыю абагульняльнага слова і перад якім пасля аднародных дзейнікаў ставіцца працяжнік;<br>4) *Белай посцілкаю ахутваў вячэрні туман палі, лугі ды рэчку.* → паміж аднароднымі дапаўненнямі, звязанымі пры дапамозе адзіночнага спалучальнага злучніка ***ды*** (=***і***), коска не ставіцца;<br>5) *Восеньскі дождж не звініць****,*** *а шапоча.* → паміж аднароднымі выказнікамі, звязанымі пры дапамозе супраціўнага злучніка, | Сінтаксіс і пунктуацыя. Культура маўлення. Знакі прыпынку ў сказах з аднароднымі членамі (з абагульняльнымі словамі і без іх) | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 1. Мінск: НІА, 2014; §§ 19, 20.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 1. Мінск: НІА, 2019; §§ 26, 27.<br>**З.І. Бадзевіч** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 8 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 37–41.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 11 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 12; практ. 99, 100, 104 |

| Заданне.<br>Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| | ставіцца коска | | |
| **А21.** Адзначце сказы, у якіх на месцы пропуску (пропускаў) трэба паставіць коску (коскі):<br>1) Мы ведаем кажаноў__ як надзвычай карысных жывёл, якія харчуюцца насякомымі-шкоднікамі.<br>2) Зімовы дзянёк__ што свечкі тоненькай агеньчык.<br>3) Матуліна ўсмешка цёплая і ясная__ быццам сонейка.<br>4) На сінім паркалі нябёс блішчаць__ нібы залатыя гузічкі__ зорачкі.<br>5) Некалькі хвілін бесперастанку ціўкаў на галінцы клёна верабей: птушачка__ нібыта не пакідала надзеі выпрасіць у шпака яго новую хатку.<br><br>**Адказ:** 3,4 | 1) *Мы ведаем кажаноў як надзвычай карысных жывёл, якія харчуюцца насякомымі-шкоднікамі.* → не аддзяляецца коскай зварот ***як надзвычай карысных жывёл***, які мае значэнне ‘ў якасці’ (*кажаны* і ёсць *надзвычай карысныя жывёлы*);<br>2) *Зімовы дзянёк што свечкі тоненькай агеньчык.* → не ставіцца коска паміж дзейнікам ***дзянёк*** і выказнікам ***што агеньчык***;<br>3) *Матуліна ўсмешка цёплая і ясная**,** быццам сонейка.* → аддзяляецца коскай параўнальны зварот ***быццам сонейка***; ***быццам*** – параўнальны злучнік;<br>4) *На сінім паркалі нябёс блішчаць**,** нібы залатыя гузічкі**,** зорачкі.* → выдзяляецца коскамі параўнальны зварот ***нібы залатыя гузічкі***; ***нібы*** – параўнальны злучнік;<br>5) *Некалькі хвілін бесперастанку ціўкаў на галінцы клёна верабей: птушачка нібыта не пакідала надзеі выпрасіць у шпака яго новую хатку.* → не ставіцца коска паміж дзейнікам ***птушачка*** і выказнікам ***нібыта не пакідала*** | Сінтаксіс і пунктуацыя. Культура маўлення. Знакі прыпынку ў сказах з параўнальнымі зваротамі | **З.І. Бадзевіч** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 8 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 52, 53.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 11 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 15 |
| **А22.** Адзначце сказы, у якіх на месцы пропуску (пропускаў) трэба паставіць знак (знакі) прыпынку:<br>1) Аздобленая срэбранымі расінкамі__ ззяла ў полі кожная травінка.<br>2) Мне ніколі не забыць паху__ спечаных бабуляй__ пірагоў.<br>3) Прагназуючы спякоту на заўтрашні дзень__ звонка стракочуць у начной цішыні нябачныя конікі.<br>4) На экзамене я адказвала__ не хвалюючыся.<br>5) Мы многія песні прысвячаем сваёй Беларусі__ любімаму краю. | 1) *Аздобленая срэбранымі расінкамі**,** ззяла ў полі кожная травінка.* → аддзяляецца коскай адасобленае дапасаванае азначэнне ***Аздобленая срэбранымі расінкамі***, якое выражана дзеепрыметнікавым зваротам, стаіць перад паяснёным назоўнікам ***травінка*** і аддзелена ад яго іншымі членамі сказа;<br>2) *Мне ніколі не забыць паху спечаных бабуляй пірагоў.* → не выдзяляецца коскамі дапасаванае азначэнне ***спечаных бабуляй***, якое выражана дзеепрыметнікавым зваротам, стаіць перад паяснёным | Сінтаксіс і пунктуацыя. Культура маўлення. Знакі прыпынку ў сказах з адасобленымі членамі | **Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 7 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 7, 16.<br>**З.І. Бадзевіч** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 8 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 46–50.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 11 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з |

| Заданне.<br>Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| **Адказ:** 1,3,5 | назоўнікам ***пірагоў*** і не мае дадатковага акалічнаснага значэння прычыны ці ўступкі;<br>3) *Прагназуючы спякоту на заўтрашні дзень***,** *звонка стракочуць у начной цішыні нябачныя конікі.* → аддзяляецца коскай адасобленая акалічнасць ***Прагназуючы спякоту на заўтрашні дзень***, выражаная дзеепрыслоўным зваротам;<br>4) *На экзамене я адказвала не хвалюючыся.* → не аддзяляецца коскай выражаная адзіночным дзеепрыслоўем акалічнасць ***не хвалюючыся***, якая стаіць у канцы сказа і сваім значэннем набліжаецца да прыслоўя спосабу дзеяння (адказвае на пытанне *як?*);<br>5) *Мы многія песні прысвячаем сваёй Беларусі* **–** *любімаму краю.* → знакам прыпынку (коскай ці працяжнікам) аддзяляецца адасоблены развіты прыдатак ***любімаму краю***, які адносіцца да назоўніка ***Беларусі*** і стаіць пасля яго | | беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 13 |
| **А23.** Адзначце сказы, у якіх няма парушэння пунктуацыйных нормаў:<br>1) Рух да мэты мусіць пачынаецца з ма́ры.<br>2) Людзі ў даўніну (пра гэта многія ведаюць) пісалі гусіным пяром.<br>3) Імхі і лішайнікі з'яўляюцца, амаль, самымі старажытнымі раслінамі на нашай планеце.<br>4) Пад ляжачы камень, як кажуць, вада не цячэ.<br>5) Сродкаў выхавання вельмі многа, аднак, найбольш дзейсным было і будзе слова.<br><br>**Адказ:** 2,4 | 1) *Рух да мэты***,** *мусіць***,** *пачынаецца з ма́ры.* → слова ***мусіць***, якое граматычна не звязана з іншымі словамі ў сказе, а ўказвае на меншую ступень упэўненасці ў паведамленні, з'яўляецца пабочным; пабочнае слова выдзяляецца коскамі;<br>2) *Людзі ў даўніну (пра гэта многія ведаюць) пісалі гусіным пяром.* → у сказе няма парушэння пунктуацыйных нормаў: сказ ***пра гэта многія ведаюць***, які па сэнсе не звязаны з асноўным зместам сказа, а падаецца як дадатковая заўвага, з'яўляецца ўстаўным; устаўная канструкцыя бярэцца ў дужкі або выдзяляецца з двух бакоў працяжнікамі;<br>3) *Імхі і лішайнікі з'яўляюцца амаль самымі старажытнымі раслінамі на нашай планеце.* → часціца ***амаль*** коскамі не | Сінтаксіс і пунктуацыя. Культура маўлення. Знакі прыпынку ў сказах з пабочнымі і ўстаўнымі канструкцыямі | **З.І. Бадзевіч** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 8 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; § 44.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 11 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 14 |



УАДЗНК

| Заданне. Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| | выдзяляецца;<br>4) *Пад ляжачы камень, як кажуць, вада не цячэ.* → у сказе няма парушэння пунктуацыйных нормаў: сказ ***як кажуць***, які граматычна не звязаны з іншымі словамі ў сказе, а ўказвае на крыніцу паведамлення, з'яўляецца пабочным; пабочны сказ выдзяляецца коскамі;<br>5) *Сродкаў выхавання вельмі многа, аднак найбольш дзейсным было і будзе слова.* → пасля супраціўнага злучніка ***аднак***, які звязвае дзве часткі складаназлучанага сказа, коска не ставіцца | | |
| **А24.** Адзначце складаназлучаныя сказы, паміж часткамі якіх трэба паставіць знак прыпынку:<br>1) Зноў стаяць у золаце бярозкі і апенькамі пні абраслі.<br>2) Якія мяккія маміны далоні і колькі ў іх цеплыні!<br>3) Больш за 500 порцый ежы прыносіць у гняздо мухалоўка і кожная порцыя складаецца з дзясяткаў насякомых.<br>4) Яшчэ дзень-два і загарацца факелы каштанаў.<br>5) У майскім садочку то вішні вэлюмам акрыюцца то яблыні нейлонам беленькім ахутаюць свае галінкі.<br><br>**Адказ:** 3,4,5 | 1) *Зноў стаяць у золаце бярозкі і апенькамі пні абраслі.* → паміж часткамі складаназлучанага сказа са спалучальнымі сэнсавымі адносінамі перад адзіночным спалучальным злучнікам ***і*** коска не ставіцца, бо ў першай частцы ёсць агульная для абедзвюх частак акалічнасць ***Зноў***;<br>2) *Якія мяккія маміны далоні і колькі ў іх цеплыні!* → паміж часткамі складаназлучанага сказа, якія маюць клічную інтанацыю, перад адзіночным спалучальным злучнікам ***і*** коска не ставіцца;<br>3) *Больш за 500 порцый ежы прыносіць у гняздо мухалоўка**,** і кожная порцыя складаецца з дзясяткаў насякомых.* → паміж часткамі складаназлучанага сказа са спалучальнымі сэнсавымі адносінамі перад адзіночным спалучальным злучнікам ***і*** ставіцца коска;<br>4) *Яшчэ дзень-два* **–** *і загарацца факелы каштанаў.* → паміж часткамі складаназлучанага сказа, якія паказваюць на хуткую змену падзей і звязаны спалучальным злучнікам ***і***, ставіцца працяжнік;<br>5) *У майскім садочку то вішні вэлюмам* | Сінтаксіс і пунктуацыя. Культура маўлення. Знакі прыпынку паміж часткамі ў складаназлучаных сказах | **Н.М. Гардзей** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 9 класа агульнаадукацыйных устаноў з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2011; §§ 6–11.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 9 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2019; §§ 10–14.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 11 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 16 |

| **Заданне.<br>Адказ** | **Разбор задання** | **Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу** | **Вучэбны дапаможнік** |
|---|---|---|---|
| | *акрыюцца**,** то яблыні нейлонам беленькім ахутаюць свае галінкі.* → паміж часткамі складаназлучанага сказа з размеркавальнымі сэнсавымі адносінамі, звязанымі паўторным размеркавальным злучнікам ***то* – *то***, ставіцца коска | | |
| **А25.** Адзначце складаназалежныя сказы, у якіх на месцы пропуску ***не трэба*** ставіць знак прыпынку:<br>1) Калі лёс далёка закіне ад родных ніў, ад бацькоўскага двара__ мне напомняць аб Айчыне васілёк і верш Купалы-песняра.<br>2) Дзіўна сінела неба чыстае, бо маладая красуня вясна__ каб падсініць хмар касынкі пушыстыя, сінькі ўвысь сыпанула спаўна.<br>3) Дзівосных колераў шмат на прыгожай зямлі__ што ласкава завуць Белай Руссю.<br>4) Каб самому зблізку ўбачыць неба__ і каб звысоку глянуць на зямлю, навучыцца самастойна трэба лётаць маладому жураўлю.<br>5) Заўважана, што__ калі плiскi i буслы прыляцяць рана, то будзе добры лён.<br><br>**Адказ:** 4,5 | 1) *Калі лёс далёка закіне ад родных ніў, ад бацькоўскага двара**,** мне напомняць аб Айчыне васілёк і верш Купалы-песняра.* → складаназалежны сказ, у якім трэба аддзяліць коскай дададую частку ***Калі лёс далёка закіне ад родных ніў, ад бацькоўскага двара***, што стаіць перад галоўнай і звязана з ёй пры дапамозе падпарадкавальнага злучніка ***калі***;<br>2) *Дзіўна сінела неба чыстае, бо маладая красуня вясна**,** каб падсініць хмар касынкі пушыстыя, сінькі ўвысь сыпанула спаўна.* → складаназалежны сказ з дзвюма даданымі часткамі, у якім выдзяляецца коскамі даданая частка ***каб падсініць хмар касынкі пушыстыя***, што стаіць у сярэдзіне дададай часткі ***бо маладая красуня вясна сінькі ўвысь сыпанула спаўна***;<br>3) *Дзівосных колераў шмат на прыгожай зямлі**,** што ласкава завуць Белай Руссю.* → складаназалежны сказ, у якім трэба аддзяліць коскай дададую частку ***што ласкава завуць Белай Руссю***, якая стаіць пасля галоўнай і звязана з ёй пры дапамозе злучальнага слова ***што***;<br>4) *Каб самому зблізку ўбачыць неба і каб звысоку глянуць на зямлю, навучыцца самастойна трэба лётаць маладому жураўлю.* → складаназалежны сказ з дзвюма даданымі часткамі ***Каб самому зблізку ўбачыць неба і каб звысоку глянуць на зямлю***, якія паясняюць у галоўнай выказнік | Сінтаксіс і пунктуацыя. Культура маўлення. Знакі прыпынку паміж часткамі ў складаназалежных сказах | **Н.М. Гардзей** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 9 класа агульнаадукацыйных устаноў з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2011; §§ 13–21, 23, 24.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 9 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2019; §§ 15–24.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 11 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 17 |

| Заданне. Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| | ***навучыцца трэба***, адказваюць на адно і тое ж пытанне *з якой мэтай?* і з’яўляюцца аднароднымі; паміж аднароднымі даданымі часткамі, звязанымі адзіночным спалучальным злучнікам ***і***, коску ставіць ***не трэба***;<br>5) *Заўважана, што калі пліскі і буслы прыляцяць рана, то будзе добры лён.* → складаназалежны сказ з дзвюма даданымі часткамі ***што калі пліскі і буслы прыляцяць рана, то будзе добры лён***, дзе паміж падпарадкавальнымі злучнікамі ***што*** і ***калі***, якія стаяць побач, коску ставіць ***не трэба***, бо ёсць другая частка ***то*** парнага злучніка ***калі – то*** | | |
| **А26.** Адзначце бяззлучнікавыя складаныя сказы, у якіх на месцы пропуску трэба паставіць двукроп’е:<br>1) Даўно вядома__ з адкладу няма ладу.<br>2) Выйшаўшы раненька з хаты, заўважаю__ на вуліцы, у садзе, на двары вясна снег падмятае.<br>3) У горадзе я калісьці з цяжкасцю прывыкаў да шуму__ цяпер у вёсцы мне даводзіцца прывыкаць да цішыні.<br>4) Шпакі нездарма лічацца сапраўднымі спевакамі-парадыстамі__ яны запамінаюць і дакладна пераймаюць галасы многіх птушак.<br>5) Пераскочыла вавёрка з сасны на сасну__ паляцеў з галінак снег на зямлю.<br><br>**Адказ:** 1,2,4 | 1) *Даўно вядома**:** з адкладу няма ладу.* → паміж дзвюма часткамі бяззлучнікавага складанага сказа ставіцца двукроп’е, бо другая частка раскрывае, удакладняе змест першай; паміж часткамі можна ўставіць злучнік ***што***;<br>2) *Выйшаўшы раненька з хаты, заўважаю**:** на вуліцы, у садзе, на двары вясна снег падмятае.* → паміж дзвюма часткамі бяззлучнікавага складанага сказа ставіцца двукроп’е, бо другая частка дапаўняе першую, развіваючы дзеяслоў-выказнік ***заўважаю***; паміж часткамі можна ўставіць злучнік ***што***;<br>3) *У горадзе я калісьці з цяжкасцю прывыкаў да шуму **–** цяпер у вёсцы мне даводзіцца прывыкаць да цішыні.* → паміж дзвюма часткамі бяззлучнікавага складанага сказа ставіцца працяжнік, бо іх змест супрацьпастаўляецца; паміж часткамі можна ўставіць супраціўны злучнік ***а***;<br>4) *Шпакі нездарма лічацца сапраўднымі спевакамі-парадыстамі**:** яны запамінаюць і* | Сінтаксіс і пунктуацыя. Культура маўлення. Знакі прыпынку паміж часткамі ў бяззлучнікавых складаных сказах | **Н.М. Гардзей** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 9 класа агульнаадукацыйных устаноў з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2011; §§ 26–29.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 9 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2019; §§ 25–29.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 11 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 18 |



УАНВ

| Заданне.<br>Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў.<br>Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| | *дакладна перaймаюць галасы многіх птушак.* → паміж дзвюма часткамі бяззлучнікавага складанага сказа ставіцца двукроп’е, бо ў другой часткі ўказваецца прычына таго, пра што гаворыцца ў першай; паміж часткамі можна ўставіць злучнікі ***бо***, ***таму што***;<br>5) *Пераскочыла вавёрка з сасны на сасну* **–** *паляцеў з галінак снег на зямлю.* → паміж дзвюма часткамі бяззлучнікавага складанага сказа ставіцца працяжнік, бо другая частка паказвае на вынік таго, пра што гаворыцца ў першай часткі | | |

УА "РІКВ"

| Заданне.<br>Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| **А27.** Адзначце варыянт адказу, дзе ўказана лічба, на месцы якой у сказе ***не трэба*** ставіць знак прыпынку:<br><br>*Жнівень – гэта летні месяц*$_1$ *але бываюць такія ночы ў канцы жніўня*$_2$ *якія наступаюць вельмі хутка*$_3$ *і якія прасякнуты журботным подыхам восені*$_4$ *начная цемра не празрыстая, а глухая і цягучая*$_5$ *гараць у цёмным небе буйны́я зоры, а Млечны Шлях нагадвае ячменнае зерне, густа рассыпанае з незавязанага мяшка.*<br><br>1) 1;<br>2) 2;<br>3) 3;<br>4) 4;<br>5) 5.<br><br>**Адказ:** 3 | **І** [1)] *Жнівень – гэта летні месяц*, **ІІ** [2)]*але бываюць такія ночы ў канцы жніўня,* [3)]*якія наступаюць вельмі хутка і* [4)]*якія прасякнуты журботным подыхам восені:* **ІІІ** [5)]*начная цемра не празрыстая, а глухая і цягучая,* [6)]*гараць у цёмным небе буйны́я зоры,* [7)]*а Млечны Шлях нагадвае ячменнае зерне, густа рассыпанае з незавязанага мяшка.* → лічба, на месцы якой у складаным сказе з рознымі відамі сувязі частак не трэба ставіць знак прыпынку, – **3**:<br>1) паміж сэнсавымі часткамі **І** і **ІІ** з супраціўнымі сэнсавымі адносінамі перад супраціўным злучнікам ***але*** трэба паставіць коску;<br>2) у сэнсавай частцы **ІІ** аднародныя даданыя часткі **3** і **4** трэба аддзяліць коскай ад галоўнай часткі **2**;<br>3) у сэнсавай частцы **ІІ** паміж аднароднымі даданымі часткамі **3** і **4**, звязанымі спалучальным злучнікам ***і***, ***не трэба ставіць знак прыпынку***;<br>4) паміж сэнсавымі часткамі **ІІ** і **ІІІ**, якія аб’яднаны пры дапамозе бяззлучнікавай сувязі, трэба паставіць двукроп’е, бо частка **ІІІ** раскрывае, удакладняе змест часткі **ІІ**;<br>5) у сэнсавай частцы **ІІІ** паміж часткамі **5** і **6**, якія аб’яднаны пры дапамозе бяззлучнікавай сувязі, трэба паставіць коску, бо ў іх выражаюцца адносіны адначасовасці з’яў | Сінтаксіс і пунктуацыя. Культура маўлення. Знакі прыпынку паміж часткамі ў складаных сказах з рознымі відамі сувязі частак | **Н.М. Гардзей** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 9 класа агульнаадукацыйных устаноў з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2011; §§ 31, 32.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 9 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2019; §§ 30, 31.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 11 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 19 |

УАРКВ

| Заданне. Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| **А28.** Адзначце сцверджанне, якое адпавядае сказу з простай мовай:<br>*«Паглядзі, якая ў возеры янтарная вада, – сказаў тата – Такой яна бывае толькі ўранні ці ўвечары».*<br>1) у сказе адсутнічае двукроп'е;<br>2) у сказе адсутнічае кропка;<br>3) у сказе адсутнічае коска;<br>4) простая мова няправільна заключана ў двукоссе;<br>5) у сказе пастаўлены ўсе неабходныя знакі прыпынку.<br>**Адказ:** 2 | *«Паглядзі, якая ў возеры янтарная вада, – сказаў тата. – Такой яна бывае толькі ўранні ці ўвечары».* → сказу адпавядае сцверджанне пад нумарам **2**:<br>1) сказ з простай мовай, у якім словы аўтара стаяць у сярэдзіне простай мовы, падзяляючы яе на дзве часткі – закончаныя сказы; пасля слоў аўтара перад працяжнікам трэба паставіць *кропку* | Сінтаксіс і пунктуацыя. Культура маўлення. Знакі прыпынку ў сказах з простай мовай | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 1. Мінск: НІА, 2014; § 23.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 1. Мінск: НІА, 2019; § 30.<br>**Н.М. Гардзей** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 9 класа агульнаадукацыйных устаноў з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2011; §§ 35, 36.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 9 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2019; § 32.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 11 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 21 |

**Тэкст да заданняў А29, А30, В1–В6**

(1) *У думках-мроях Лёшка і не прыкмеціў, як прайшоў палавіну дарогі.* (2) *Наблізіўся да пясчанага пагорка, дзе ўперамешку з беланогімі бярозкамі расліцягнуліся ўвысь толькі маладыя сасонкі.* (3) *За імі, крыху лявей, пачынаўся стары лес, які зараз, у вечаровай шэрані, нагадваў суцэльную сцяну.* (4) *У лесе час ад часу крычала нечым занепакоеная птушка.* (5) *А тут, у полі, званочкам вызвоньваў нешта дужа прыгожае жаваранак.* (6) *Лёшка ўсміхнуўся: «Вось шчыруе! І дня яму не хапіла, каб наспявацца, нарадавацца* ***вясне****».*

(7) *Жадаючы* ***скараціць*** *шлях да рэйкавай чыгункі, Лёшка вырашыў ісці праз лес.* (8) *Толькі ўвайшоў ён у лясное царства, як адразу адчуў: ад свежага паветра ўсё яго цела налілося незвычайнай лёгкасцю.* (9) *Настрой відавочна палепшыўся.* (10) *Задуменнасць змянілася на бадзёрасць, узнёсласць.*

(11) *Раптам у шырокім прагале крокаў за дзесяць ад сябе Лёшка ўбачыў магутнага лася.* (12) *Хлопец спыніўся як укопаны.* (13) *Ніколі яшчэ так блізка не бачыў ён ляснога велікана.* (14) *Лось, грацыёзна павярнуўшы ў бок нечаканага сустрэчнага галаву, паварушыў вялікімі вушамі, страсянуў грывай і застаўся стаяць на месцы, быццам гаворачы: «Ідзі ты,* ***мой*** *чалавеча, куды ішоў!»*

(15) *Лёшка зразумеў, што лось для яго не пагроза, і спакойна пакрочыў далей.* (16) *Да* ***чыгункі*** *заставалася ўжо зусім блізка, і хлопец уголас пашкадаваў:*

| **Заданне. Адказ** | **Разбор задання** | **Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу** | **Вучэбны дапаможнік** |
|---|---|---|---|
| *«Аднак вельмі кароткі шлях! Гэта ж колькі магло быць цікаўных прыгод, калі б ён быў даўжэйшы!»* | | | |
| **А29.** Адзначце правільнае сцверджанне ў дачыненні да тэксту:<br>1) тэкст мастацкага стылю;<br>2) тэкст афіцыйнага стылю;<br>3) тэкст навуковага стылю;<br>4) тэкст публіцыстычнага стылю;<br>5) тэкст гутарковага стылю.<br><br>**Адказ:** 1 | тэксту адпавядае сцверджанне пад нумарам **1**: тэкст ***мастацкага стылю***, таму што:<br>1) уяўляе сабой свабоднае, натуральна арганізаванае маўленне, якое характэрна для мастацкіх твораў розных жанраў: *раман*, *аповесць*, *апавяданне*;<br>2) яго галоўная асаблівасць – адзінства рэалізацыі камунікатыўнай і эстэтычнай функцый: словы не толькі перадаюць пэўны змест, але і, з'яўляючыся сродкам фарміравання мастацкіх вобразаў, уздзейнічаюць на думкі і пачуцці чытача;<br>3) эмацыянальнасць, вобразнасць, яркасць тэксту надаюць вобразна-выяўленчыя сродкі: эпітэты (з *беланогімі* бярозкамі, *маладыя* сасонкі, *стары* лес, *занепакоеная* птушка); метафары (*званочкам вызвоньваў жаваранак*, *цела налілося лёгкасцю*); словы з памяншальна-ласкальным значэннем (*Лёшка*, *сасонкі*, *званочкам*); сказы з простай мовай (*Лёшка ўсміхнуўся: «Вось шчыруе! І дня яму не хапіла, каб наспявацца, нарадавацца* ***<u>вясне</u>***»; *Лось … застаўся стаяць на месцы, быццам гаворачы: «Ідзі ты,* ***<u>мой</u>*** *чалавеча, куды ішоў!»*); фразеалагізм (*як укопаны*) і іншыя | Маўленне. Тэкст. Стылістыка. Функцыянальныя стылі маўлення | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 1. Мінск: НІА, 2014; § 11.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 1. Мінск: НІА, 2019; §§ 3, 4.<br>**В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 2. Мінск: НІА, 2014; § 11.<br>**В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 6 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 13, 57.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 7 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; § 2.<br>**З.І. Бадзевіч** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 8 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 3, 10, 11, 33.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 9 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. |

УЛАДКВЫ

| Заданне. Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| | | | Мінск: НІА, 2019; § 7. **Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 11 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; §§ 4–8 |
| **А30.** У адным са сказаў ***12–16*** тэксту знайдзіце лексічную памылку (няправільна ўжытае па значэнні слова). З прапанаваных слоў адзначце тое, якое павінна быць ужыта ў адным са сказаў ***12–16***:<br>1) некалі;<br>2) лясістага;<br>3) нечапанага;<br>4) вялікаснымі;<br>5) цікавых.<br><br>**Адказ:** 5 | 1) *цікавых* → у ***16-м*** сказе тэксту замест слова ***цікаўных*** (*цікаўны* – ‘*якi імкнецца ўсё пазнаць, убачыць; які пашырае свой кругагляд, папаўняе веды; дапытлівы*’) павінна быць ужыта слова **цікавых** (*цікавы* – ‘*які выклікае цікавасць, захапляе*’): *цікавых прыгод* | Лексіка. Фразеалогія. Культура маўлення. Паронімы | **Н.М. Гардзей** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 9 класа агульнаадукацыйных устаноў з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2011; С. 38. **Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 21 |
| **В1.** Знайдзіце ў ***7-м*** сказе тэксту немэтазгодна (збыткоўна) выкарыстанае слова, якое парушае правільнасць маўлення. Запішыце гэта слова ў той граматычнай форме, у якой яно пададзена ў ***7-м*** сказе.<br><br>**Адказ:** рэйкавай | 1) *рэйкавай* → ужытае ў ***7-м*** сказе тэксту слова *чыгунка* (***да чыгункі***) мае значэнне ‘*рэйкавая дарога, прызначаная для руху паяздоў*’, таму слова ***рэйкавай*** у прапанаваным сказе збыткоўнае | Маўленне. Тэкст. Стылістыка. Культура вуснага і пісьмовага маўлення. Нормы сучаснай беларускай літаратурнай мовы | **Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 7 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; § 1. **Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 11 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 2 |
| **В2.** Знайдзіце ў ***2-м*** сказе тэксту часціцу і запішыце яе.<br><br>**Адказ:** толькі | 1) *толькі* → у ***2-м*** сказе тэксту ўжыта абмежавальная часціца ***толькі*** | Марфалогія і арфаграфія. Культура маўлення. Службовыя часціны мовы | **Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 7 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 43, 44. **З.І. Бадзевіч** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 8 класа |

| Заданне. Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| | | | ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; § 4.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 45 |
| **В3.** Запішыце падкрэслены ў ***16-м*** сказе тэксту назоўнік у форме давальнага склону адзіночнага ліку.<br><br>**Адказ:** чыгунцы | 1) *чыгунцы* → назоўнік 1-га скланення ***чыгýнка*** з асновай на зычны гук [***к***] у форме давальнага склону адзіночнага ліку мае канчатак **-*ы***, бо націск падае на аснову; пры скланенні гук [***к***] чаргуецца з гукам [***ц***] | Марфалогія і арфаграфія. Культура маўлення. Назоўнікі 1-га скланення, правапіс іх склонавых канчаткаў | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 6 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; § 17.<br>**.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 29 |
| **В4.** Ад назоўніка, падкрэсленага ў ***6-м*** сказе тэксту, утварыце прыметнік пры дапамозе суфікса *-**н**-*. Запішыце гэты прыметнік у форме назоўнага склону адзіночнага ліку мужчынскага роду.<br><br>**Адказ:** вясенні | 1) *вясенні* → пры дапамозе суфікса ***-н-*** ад назоўніка ***вясна*** ўтвараецца прыметнік ***вясенні*** | Марфалогія і арфаграфія. Культура маўлення. Утварэнне і правапіс прыметнікаў | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 6 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 37, 40.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 25 |
| **В5.** Запішыце падкрэслены ў ***14-м*** сказе тэксту займеннік у форме роднага склону адзіночнага ліку мужчынскага роду.<br><br>**Адказ:** майго | 1) *майго* → прыналежны займеннік ***мой*** у родным склоне адзіночнага ліку мужчынскага роду мае форму ***майго*** | Марфалогія і арфаграфія. Культура маўлення. Скланенне займеннікаў | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 6 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 50, 53.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 36 |

<table>
<tr><th>Заданне.<br>Адказ</th><th>Разбор задання</th><th>Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу</th><th>Вучэбны дапаможнік</th></tr>
<tr><td>В6. Ад асновы дзеяслова, падкрэсленага ў 7-м сказе тэксту, утварыце поўны дзеепрыметнік залежнага стану і запішыце яго ў форме назоўнага склону адзіночнага ліку мужчынскага роду.<br><br>Адказ: скарочаны</td><td>1) скарочаны → ад асновы неазначальнай формы дзеяслова закончанага трывання скараціць з дапамогай суфікса -ан- утвараецца поўны дзеепрыметнік залежнага стану скарочаны (форма назоўнага склону адзіночнага ліку мужчынскага роду – скарочаны)</td><td>Марфалогія і арфаграфія. Культура маўлення. Дзеепрыметнікі незалежнага і залежнага стану, іх утварэнне і правапіс</td><td>Г.М. Валочка і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 7 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 8–10.<br>Г.М. Валочка і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 40</td></tr>
<tr><td>В7. З двух прапанаваных у дужках слоў вызначце тое, што адпавядае сэнсу сказа. Запішыце гэта слова ў той граматычнай форме, у якой яно павінна быць ужыта ў сказе:<br><br>Дабрабыт нашых продкаў залежаў ад (сумленнай, заклапочанай) працы на зямлі, ведання законаў прыроды, умення весці гаспадарку.<br><br>Адказ: сумленнай</td><td>1) сумленнай → слова сумленны (сумленнай) мае значэнне ‘старанны, шчыры’ і адпавядае сэнсу сказа: Дабрабыт нашых продкаў залежаў ад сумленнай працы на зямлі, ведання законаў прыроды, умення весці гаспадарку.;<br>2) слова заклапочаны мае значэнне ‘які выражае клопат, турботу’ і сэнсу сказа не адпавядае</td><td>Лексіка. Фразеалогія. Культура маўлення. Слова, яго лексічнае значэнне</td><td>В.П. Красней і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 2. Мінск: НІА, 2014; § 13.<br>Г.М. Валочка і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 2. Мінск: НІА, 2019; § 22.<br>Г.М. Валочка і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 20</td></tr>
<tr><td colspan="4">В8. Устанавіце адпаведнасць паміж словамі ў левым слупку і іх характарыстыкамі ў правым слупку. Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар левага слупка. Памятайце, што некаторыя даныя правага слупка могуць не выкарыстоўвацца ўвогуле. Напрыклад: А2Б5В3Г4.<br><br>А. Барацьбіт.<br>Б. Маленькі.<br>В. Сойка.<br>Г. Вернісаж.<br><br>1. Словы, у якіх два зацвярдзелыя зычныя гукі.<br>2. Словы, у якіх усе зычныя гукі цвёрдыя.<br>3. Словы, у якіх адзін мяккі зычны гук.<br>4. Словы, у якіх ёсць зычны гук [дз’].<br>5. Словы, у якіх націск падае на другі склад.</td></tr>
<tr><td>Адказ: А4Б5В3Г1</td><td>1) барацьбі́т → слова, у якім ёсць зычны гук [дз’]: [барадз’б’іт];<br>2) мале́нькі → слова, у якім націск падае на</td><td>Фанетыка і арфаэпія. Арфаграфія.</td><td>В.П. Красней і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з</td></tr>
</table>

| Заданне. Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| | другі склад;<br>3) *со́йка* → слова, у якім адзін мяккі зычны гук: [*с**о**йка*];<br>4) *вернiса́ж* → слова, у якім два зацвярдзелыя зычныя гукі: [*в’эрн’ісаш*] | Культура маўлення. Вымаўленне зычных гукаў, спалучэнняў зычных гукаў. Склад і націск | беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 1. Мінск: НІА, 2014; § 30.<br>**В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 2. Мінск: НІА, 2014; §§ 1, 3, 4.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 2. Мінск: НІА, 2019; §§ 6, 13–15.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 7 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; С. 263–267.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; §§ 13, 14, 16 |

**В9.** Вызначце значэнне фразеалагізмаў і ўстанавіце адпаведнасць паміж слупкамі табліцы. Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар левага слупка. Памятайце, што некаторыя даныя правага слупка могуць не выкарыстоўвацца ўвогуле. Напрыклад: А2Б5В3Г4.

| | |
|---|---|
| **А.** Мераць адной меркай.<br>**Б.** У адной меры.<br>**В.** Без меры.<br>**Г.** Па крайняй меры. | **1.** Мае значэнне *‘без змен; такі самы, як і быў’*.<br>**2.** Мае значэнне *‘столькі, колькі трэба’*.<br>**3.** Мае значэнне *‘меркаваць пра каго-небудзь зусім аднолькава’*.<br>**4.** Па значэнні адпавядае фразеалагізму *цьма цьмушчая*.<br>**5.** Па значэнні адпавядае фразеалагізму *ва ўсякім разе*. |

УА "РІКВ"

| **Заданне.<br>Адказ** | **Разбор задання** | **Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу** | **Вучэбны дапаможнік** |
|---|---|---|---|
| **Адказ:** А3Б1В4Г5 | 1) *мерацъ адной меркай* → мае значэнне *‘меркаваць пра каго-небудзь зусім аднолькава’*;<br>2) *у адной меры* → мае значэнне *‘без змен; такі самы, як і быў’*;<br>3) *без меры* → па значэнні (*вельмі многа*) адпавядае фразеалагізму *цьма цьмушчая*;<br>4) *па крайняй меры* → па значэнні (*прынамсі*) адпавядае фразеалагізму *ва ўсякім разе*; фразеалагізмы *па крайняй меры* і *ва ўсякім разе* ўжываюцца ў значэнні пабочныя канструкцый | Лексіка. Фразеалогія. Культура маўлення. Фразеалагізмы, іх роля ў маўленні | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 2. Мінск: НІА, 2014; § 22.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 2. Мінск: НІА, 2019; § 32.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 22 |

**В10.** Вызначце спосаб утварэння прыведзеных слоў і ўстанавіце адпаведнасць паміж слупкамі табліцы. Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар левага слупка. Памятайце, што некаторыя даныя правага слупка могуць не выкарыстоўвацца ўвогуле. Напрыклад: А2Б5В3Г4.

| | |
|---|---|
| **А.** Падказка.<br>**Б.** Бясследны.<br>**В.** Насупраць.<br>**Г.** Куды-небудзь. | **1.** Прыставачна-суфіксальны.<br>**2.** Суфіксальны.<br>**3.** Бяссуфіксны.<br>**4.** Постфіксальны.<br>**5.** Прыставачны. |

| | | | |
|---|---|---|---|
| **Адказ:** А2Б1В5Г4 | 1) *падказка* → слова ўтворана суфіксальным спосабам: ***падказ**/а/-(ць)* + суфікс -***к***-;<br>2) *бясследны* → слова ўтворана прыставачна-суфіксальным спосабам: ***след***- + прыстаўка ***бяс***- і суфікс -***н***-;<br>3) *насупраць* → слова ўтворана прыставачным спосабам: ***супраць*** + прыстаўка ***на***-;<br>4) *куды-небудзь* → слова ўтворана постфіксальным спосабам: ***куды***- + постфікс -***небудзь*** | Марфемная будова слова. Словаўтварэнне і арфаграфія. Культура маўлення. Асноўныя спосабы ўтварэння слоў | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 2. Мінск: НІА, 2014; §§ 31, 32.<br>**В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 6 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 24, 37.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: |

| Заданне.<br>Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў.<br>Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| | | | вучэбны дапаможнік для 7 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 23–25.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 25 |

УА "РІКВ"